УДК 94 (476) + 378.115

# «ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА МАГІЛЕВА» ЯК ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАЯ ВУЧЭБНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА Ў СІСТЭМЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

**Пушкін І.А.**
Установа адукацыі
«Магілеўскі дзяржаўны універсітэт харчавання»
г. Магілеў, Рэспубліка Беларусь

Беларускае Падняпроўе самы цікавы рэгіен Усходняй Еўропы. Невыпадкова менавіта тут былі выяўлены самыя старажытныя ў Беларусі стаянкі першабытных людзей. На працягу стагоддзяў Магілеўшчына і горад Магілеў знаходзіліся на месцы сутыкнення чалавечых інтарэсаў і канфліктаў: рэлігійных, міждзяржаўных, нацыянальных. Але магілеўцы імкнуліся пакінуць пасля сябе дабро, веліч, высокародныя ўчынкі, прыгажосць, памкненні, увасобленыя ў помніках матэрыяльнай і духоўнай культуры. Магілеў зведаў багацце і веліч, войны і разбурэнні, уздым і заняпад. Нягледзячы ні на што, захаваў у гістарычнай і культурнай спадчыне магілеўцаў своеасаблівасць і адметнасць, якія вартыя памяці і ўшанавання [1].

З атрыманнем незалежнасці ў грамадскай, асобаснай, а таксама навуковай свядомасці постсавецкіх супольнасцяў сфармаваўся новы падыход да разумення задач нацыянальнага развіцця. Была ўсвядомлена і сфармулявана мэта: не страта нацыянальна-патрыятычных асаблівасцяў у «савецкім народзе», а іх здабыцце – адраджэнне, фарміраванне і развіцце [2]. Менавіта гэтаму павінна паспрыяць вучэбная дысцыпліна «Гістарычная і культурная спадчына г. Магілева», якая выкладаецца ў Магілеўскім дзяржаўным універсітэце харчавання. Упершыню вучэбная праграма па

гэтый дысцыпліне для вну была распрацавана ва УА «МДУХ» у 2003 г. (аўтар – дацэнт І.А.Пушкін). Яна была створана ў адпаведнасці з нарматыўнымі і метадычнымі дакументамі, на аснове агульнаадукацыйнага стандарту сацыяльна-гуманітарных дысцыплін для вышэйшай школы. У ей улічаны ўсе патрабаванні адукацыйнага стандарту па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін.

Прадметам вывучэння дысцыпліны «Гістарычная і культурная спадчына г. Магілева» з'яўляюцца заканамернасці і рэгіянальныя асаблівасці працэсаў палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, канфесійнага, культурнага і духоўнага развіцця гарадскога насельніцтва Магілева і краю ў кантэксце агульнабеларускіх і еўрапейскіх гістарычных працэсаў. У ліку іншых дысцыплін гуманітарнага цыклу яна забяспечвае набыцце спецыялістамі наступных сацыяльна-асабовых кампетэнцый: культурна-каштоўнаснай і асабовай арыентацыі, грамадзянскасці і патрыятызму, сацыяльнага ўзаемадзеяння, камунікацыі, самаўдасканалення, што садзейнічае фарміраванню сацыяльна-прафесійных кампетэнцый, ведаў і практычных навыкаў, неабходных і дастатковых для вырашэння і выканання грамадскіх, сацыяльна-прафесійных і асабовых задач і функцый выпускнікоў тэхнічных ВНУ.

Новая вучэбная праграма, створаная ў 2012 г., прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў рамках цыклу сацыяльна-гуманітарных дысцыплін і мае адну з мэтаў – атрымаць навыкі выкарыстання гістарычнай і культурнай спадчыны г. Магілева і магілеўцаў у сучаснай эканамічнай і гаспадарчай дзейнасці. Адметнымі асаблівасцямі новай праграмы, у параўнанні з папярэдняй вучэбнай праграмай, з'яўляюцца: абноўлены змест, акцэнтуацыя на кампетэнтасным падыходзе ў навучанні, значнае ўзмацненне ролі і долі самастойнай працы студэнта, выкарыстанне сучасных інавацыйных педагагічных тэхналогій. У рамках сумеснага супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта праграма выступае своеасаблівым «навігатарам» здабыванні ведаў, інфармацыі і набыцця практыка-арыентаваных, жыццядзейных уменняў.

Агульная колькасць гадзін выкладання дысцыпліны была вызначана ў аб'еме 72 гадзіны, з іх 32 гадзіны аўдыторныя (16 гадзін лекцыі, 16 гадзін практычныя заняткі) і 40 гадзін самастойнай працы. На працягу вывучэння дысцыпліны прадугледжваліся лекцыйныя, семінарскія заняткі, правядзенне экскурсій па горадзе Магілеву і музеям горада, напісанне рэфератаў (вучэбна-даследчых прац), прамежнае тэсціраванне, напрыканцы залік у вуснай альбо пісьмовай форме. Пэўныя тэмы практычных заняткаў вызначаны ў форме экскурсій.

Дысцыпліна «Гістарычная і культурная спадчына г. Магілева» цалкам *забяспечана навучальна-метадыч*нымі дапаможнікамі (выдадзены курс лекцый, рэкамендацыі да планаў семінарскіх заняткаў і г.д.), распрацаваны і ўкаранены ў навучальны працэс курс лекцый у фармаце прэзентацыі, створаны на аснове праграмы Power Point [3].

Дапамагаюць лепш засвоіць матэрыял кнігі (манаграфіі), выдадзеныя як выкладчыкамі кафедры гуманітарных дысцыплін – А. Косцеравым, І. Пушкіным, Ф. Свінціцкім, так і іншымі вучонымі і краязнаўцамі – І. Марзалюком, М. Барысенка [4; 5; 6; 7; 8; 9; 10; 11; 12], а таксама зборнікі навуковых прац удзельнікаў міжнародных канферэнцый пад агульнай назвай «Гісторыя Магілева: мінулае і сучаснасць», якія маюцца ў бібліятэцы ўніверсітэта. Канферэнцыі праводзіліся Магілеўскім гарвыканкамам, музеем гісторыі Магілева пры ўдзеле кафедры гуманітарных дысцыплін Магілеўскага дзяржаўнага універсітэта харчавання [13; 14; 15].

У выніку вывучэння гістарычнай і культурнай спадчыны г. Магілева студэнты пазнаюць гістарычныя звесткі пра асноўныя, найболей важныя падзеі, аб з'явах, датах, іменах, заканамернасцях з гісторыі і культуры г. Магілева. Знаемяцца з дзейнасцю знакамітых асоб, звязаных з гісторыяй і культурай горада на працягу стагоддзяў. Даведваюцца пра асноўныя помнікі гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры. Вучацца характарызаваць палітычную, сацыяльна-эканамічную гісторыю Магілева, а таксама культуру, паводзіны, свядомасць, менталітэт жыхароў горада розных нацыянальнасцяў і веравызнанняў у кантэксце іх інтарэсаў [16; 17], плюралізму поглядаў і аб'яднаўчага мясцовага патрыятызму. Студэнты аналізуюць месца і ролю гісторыка-культурнай спадчыны ў асабістым жыцці чалавека, грамадства, жыхароў Магілева і краіны на сучасным этапе развіцця, а таксама супярэчлівыя працэсы фармавання канфесійнага і нацыянальнага адзінства грамадзян у складзе гарадской адміністратыўнай адзінкі. Знаемяцца з дзейнасцю мясцовых органаў самакіравання ад сярэднявечча да нашага часу. Набываюць навыкі вызначэння ўзаемасувязі агульнагістарычных працэсаў і з'яў з асобнымі падзеямі гарадскога жыцця, агульнагарадской талерантнасці, выкарыстання гістарычнай і культурнай спадчыны ў сваей практычнай гаспадарчай дзейнасці.

Аўтар курса адабраў з вялікай колькасці падзей і асобаў, на яго думку, найбольш цікавыя, якія можна выкарыстаць сучаснікамі ў сваей практычнай дзейнасці. На семінарскіх занятках, падчас складання студэнтамі бізнес-планаў, спадчына Магілева і магілеўцаў знаходзіць свае прымяненне ў сферы вытворчасці і рэалізацыі прадуктаў харчавання, турызме, рэкламе, стварэнні архітэктурных і геаграфічна-ландшафтных асяродкаў, у назвах харчовых брэндаў, прадпрыемстваў, фірм, крам, кавярняў, рэстаранаў, тавараў, блюд і г.д. Студэнты, працуючы над стварэннем прадукта харчавання, прадпрыемства па яго вытворчасці або рэалізацыі, аб'екта грамадскага харчавання, распрацоўваюць: назву, выгляд, таварны знак, брэнд, афармленне (упакоўка, вітрына, стэнд і г.д.), каляровую гаму, рэкламу. Абавязкова абгрунтоўваюцца інавацыйнасць праекта, выдаткі і прыбыткі, пралічваюцца сфера выкарыстоўвання і рэалізацыі, катэгорыя спажыўцоў, шляхі пасоўвання на рынак, звязаныя з аб'ектам бізнэс-плана тавары, магчымасць узнікнення новых відаў ці шляхі пашырэння справы. Усе гэта накіравана на эфектыўнасць працы, таму прысутнічае эканамічнае,

гістарычнае і патрыятычна-выхаваўчае абгрунтаванне, сувязь з прадметам дысцыпліны і спецыялізацыяй студэнтаў.

Такім чынам, выкладанне гістарычнай і культурнай спадчыны актуалізуе ў студэнцкай моладзі нацыянальную гістарычную памяць, якая гарантуе пераемнасць агульначалавечага і культурнага прагрэсу, далучанасць да культурна-гістарычнага жыцця народа, фарміраванне пачуцця ўкаранёнасці ў сваей айчыне, патрыятызму і адказнасці за лёс народа і краіны. Пад час вывучэння дысцыпліны фарміруюцца прыярытэтныя каштоўнасці беларускага народа: правы чалавека, грамадзянскасць, каштоўнасці роднай мовы, уласнай гісторыі, нацыянальных традыцый, звычаяў, агульначалавечыя ідэалы дабра, праўды, справядлівасці. У студэнтаў замацоўваецца павага да гістарычнага мінулага свайго народа, гонар за яго дасягненні, актывізуецца дзейнасць па стварэнню новага, прагрэсіўнага, пры абавязковай павазе да іншых народаў, іх мовы, культуры, гісторыі. Выкарыстоўванне гістарычнай і культурнай спадчыны ў гаспадарчай дзейнасці дазваляе зрабіць выснову аб дысцыпліне як практыка-арыентаванай у сістэме вышэйшай адукацыі

Спіс літаратуры

1 Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Магілева / Беларус. Энцыкл.; Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭн, 1998. – 496 с.

2 Этнонациональное и религиозное самоопределение белорусов / И.Л. Коган, С.В. Моложанова, В.И. Русецкая и др.; Науч. ред. Е.М. Бабосов. – Минск: ООО «ФУАинформ», 2002. – 128 с.

3 Пушкін, І.А. Гістарычная і культурная спадчына горада Магілева: Курс лекцый / І.А. Пушкін. – Магілеў: УА «МДУХ», 2006. – 150 с.

4 Костеров, А. Бессмертный подвиг защитников Могилева летом 1941 года / А. Костеров. – Могилев: Мог. обл. типография, 2004. – 206 с.

5 Костеров, А.П. Оборонительные бои на Могилевском направлении летом 1941 года / А.П. Костеров. – Минск: Издательский центр БГУ, 2010. – 186 с.

6 Агеев, А.Г. Перекрестки могилевской истории / А.Г. Агеев, Я.И. Климуть, И.А. Пушкин – Минск: Туринфо, 2004. – 216 с.

7 История Могилевского еврейства: Документы и люди: Науч. популяр. очерки и жизнеописания. В 2–х кн. / сост. А. Литин. – Минск: Юнипак, 2002. – Кн.1. – 256 с.; 2006. – Кн. 2, ч. 1. – 388 с.; Могилев: АмелияПринт, 2009. – Кн. 2, ч. 2. – 396 с.; 2011. – Кн. 2, ч. 3. – 516 с.

8 Курков, И. Могилевщина: легенды, события, люди / И. Курков, И. Пушкин. – Минск: Медиафакт, 2008. – 368с.

9 Пушкин, И.А. Исторический очерк создания и деятельности Могилевского государственного университета продовольствия / И.А. Пушкин // 35 лет Могилевскому государственному университету продовольствия / редкол.; В.А. Шаршунов (пред.). – Минск: Изд. центр БГУ, 2009. – С. 2–53.

10 Свинтицкий, Ф.А. Могилевская наступательная операция 1944 года: монография / Ф.А. Свинтицкий. – Могилев: МГУП, 2012. – 2012. – 208 с.

11 Марзалюк, І.А. Магілеў ў XII – XVIII стст. Людзі і рэчы / І.А. Марзалюк. – Магілеў – Мінск: Веды, 1998. – 260 с.

12 Борисенко, Н.С. Могилевщина – мой любимый Приднепровский край / Н.С. Борисенко. – Могилев: Могилев. обл. укруп. тип., 2007. – 832 с.

13 Гістарычнае і сацыякультурнае развіцце Магілева: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А. Пушкін, В.В. Юдзін. – Магілеў: Могилев. обл. укруп. тип., 2007. – 368 с.

14 Мінулая і сучасная гісторыя Магілева: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А. Пушкін. – Магілеў: УПКП «Магілеўская абласная узбуйненая друкарня», 2001. – 368 с.

15 Шляхі Магілеўскай гісторыі: зборнік навуковых прац / Уклад. І.А. Пушкін, В.В. Юдзін. – Могилев: УПКП «Могилевская обл. типография им. С.Соболя», 2005. – 488 с.

16 Пушкін, І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія / І.А. Пушкін. – Магілеў: МДУ імя А.А.Куляшова, 2007. – 206 с.

17 Пушкін, І.А. Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.): манаграфія / І.А. Пушкін. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 320 с.